1937

# Канстытуцыя БССР — чудадзейная сіла

(ВЫСТУПЛЕНИЕ НА НАДЗВЫЧАЙНЫМ ХП УСЕБЕЛАРУСКІМ З"ЕЗДЗЕ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ)

~~Таварышы!~~ Правы грамадзян Савецкай Беларусі, запісаныя ў Праекце нашай Канстытуцыі, з"яўляюцца не далёкай марай, не абрысамі будучыні, а жывой рэчаіснасцю, дасягнутай за гады пралетарскай рэвалюцыі пад кіраўніцтвам партыі Леніна, у гераічнай барацьбе са шматлікімі ворагамі савецкага народа.

Правы грамадзян Савецкай Беларусі на працу, на асвету, на адпачынак, уключаюць у сябе і вялікае, заваяванае народам, права на творчасць, на мастацтва.

Бурна расце культурны ~~уздым~~ ўзровень народа. Няма ніводнага кутка, ніводнага паселішча ў нашай краіне, дзе б не гучала вясёлая песня народа, складзеная самім народам, пра барацьбу, пра сваё чалавечае радаснае жыццё.

Мастацкая самадзейнасць працоўных, так шырока разгорнутая ў нашай рэспубліцы, з"яўляецца фактам выключна вялікага палітычнага значэння. Уздым мастацкай самадзейнасці сведчыць аб новых сацыялістычных формах росту культуры, аб бліскучых умовах развіцця талентаў у гушчы народных мас.

Расце і беларуская савецкая мастацкая літаратура. Рад твораў нашай літаратуры сведчыць аб ідэйным росце пісьменнікаў, аб іх узбагачэнні мастацкімі сродкамі, аб тэматычнай разнастайнасці, якасцях народнасці, так неабходных мастацкай літаратуры эпохі будаўніцтва сацыялізма. Карл Маркс гаварыў, што буржуазнаму грамадству варожа сапраўднае мастацтва. Сапраўднае мастацтва плённым росквітам красуе ў нас — у нашай сацыялістычнай Радзіме.

Усё вышэй і напорысцей уздымаецца да вяршынь свайго развіцця беларуская нацыянальная па форме і сацыялістычная па зместу культура.

Баявы атрад культуры -- мастацкая літаратура беларускага народа, асабліва за апошнія гады свайго развіцця, мае рад выдатных дасягненняў.

Мы можам прывесці не адзін твор нашай літаратуры, які яскрава паказвае людзей і іх барацьбу за перамогу сацыялізма, горда запісаную народам у сваёй Канстытуцыі.

Канстытуцыя БССР -- цудадзейная сіла, небывалы ўздым творчых пачуццяў народа, а гэта значыць і ўздым сацыялістычнага мастацтва.

Чалавек стаў каштоўным капіталам. Жыццё стала шчаслівым, яскравым, поўным творчасці і радасці. Бязмерна шырыцца любоў народа да сваёй бацькаўшчыны.

Творчая актывізацыя і рост савецкіх пісьменнікаў бясспрэчны. Нашым поспехам з"яўляецца работа групы пісьменнікаў над апрацоўкай матэрыялаў для гісторыі грамадзянскай вайны ў Беларусі.

Упершыню ў гісторыі беларускай літаратуры на беларускай мове з"явіліся творы вялікага рускага паэта Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. Дабраякасныя ў большасці пераклады твораў геніяльнага паэта на беларускую мову ўзбагачаюць беларускую літаратуру выдатнымі помнікамі класічнага мастацтва, уключаюць у нашу літаратуру багацці скарбніцы культуры чалавецтва, а беларускія пісьменнікі прайшлі вялікую школу па авалоданню паэтычнага майстэрства.

Мастацкая літаратура -- магутная зброя барацьбы супраць ворагаў народа -- у руках партыі Леніна, у руках рабочага кла-

са. Беларуская савецкая мастацкая літаратура вырасла і стала актыўнай сілай у барацьбе за сацыялізм.

Мы зламалі рамкі нацыянальнай абмежаванасці. Калі буржуазныя нацыяналісты шкодніцкі затрымлівалі развіццё беларускай савецкай літаратуры, не давалі магчымасці ёй шырока разгортвацца, ~~не пусцілі яе далей станцыі Орша,~~ дык пад кіраўніцтвам нашай партыі, сваім бурным ростам беларуская савецкая мастацкая літаратура атрымала плацкарту на права выезду ў любы куток нашага вялікага неабсяжнага Савецкага Саюза.

Беларуская савецкая літаратура з"яўляецца адным з таленавітых атрадаў літаратуры Савецкага Саюза. Імёны некаторых беларускіх паэтаў вядомы не толькі чытачам Савецкай Беларусі, але і шматмільённым чытачам нашай сацыялістычнай Радзімы.

Буржуазныя нацыяналісты абвясцілі жорсткі век дзікага рабства і прыгону "залатым векам". Сапраўдны залаты век беларускага народа пачаўся ў дні Вялікай пралетарскай рэвалюцыі, якая вызваліла народ ад нацыянальнага і сацыяльнага рабства, калі Беларусь стала ардэнаноснай краінай сацыялізма, краінай культурнага заможнага жыцця.

Ні фашысцкія падпальшчыкі вайны, ні вырадкі-нацыяналісты не могуць спыніць наш ~~шлях~~ агу руху да камунізма. У апошніх рашучых баях вялікая Канстытуцыя будзе сцягам усяго перадавога чалавецтва.

~~Таварышы,~~ мы напярэдадні ~~XX~~ Нашай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гэта слаўная гістарычная дата падвядзе сусветна-гістарычныя вынікі перамогі сацыялізма на адной шостай частцы свету. Яна падвядзе вынікі магутнага росту савецкага сацыялістычнага мастацтва.

Гэта ставіць перад савецкай мастацкай літаратурай велізарныя задачы. Савецкая літаратура павінна адзначыць гэтую гіста-

рычную дату добрымі творамі. Справа гонару кожнага пісьменніка Беларусі прыйсці да ~~XX~~ нацыянальн гадавіны з творамі, вартымі заваёў сацыялізма, вартымі вялікай Канстытуцыі. Гэтыя творы павінны быць насычаны непрымірымай нянавісцю да ворагаў народа і бязмежнай любоўю да сацыялістычнай Радзімы, да магутнай Камуністычнай партыі бальшавікоў. Гэтыя творы павінны быць народнымі ў лепшым сэнсе гэтага слова, даступнымі народным масам, насычанымі іх мужнасцю, іх мудрасцю.

Мы~~, таварышы дэлегаты з"езда,~~ адзінадушна і з радасцю зацвердзілі праект Канстытуцыі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Пра нашу Канстытуцыю вякі і пакаленні будуць складаць казкі і песні. Наша Канстытуцыя — гэта акт на вечнае карыстанне шчасцем.

~~Слава нашай Канстытуцыі — Канстытуцыі перамогшага сацыялізма!~~

~~Няхай жыве партыя Леніна — крыніца нашага жыцця!~~

~~Слава свабоднаму беларускаму народу!~~

~~Няхай жыве і квітнее вялікая краіна сацыялізма!~~

[signature]

1937